**УДК 930.2:27**

# САКРАМЕНТАЛЬНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА Ў БЕЛАРУСІ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

***К.В. СЫЦЬКО***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі)***

*Комплексна разглядаюцца гістарычныя крыніцы, звязаныя са святадзеяннем, выяўленыя падчас археаграфічных экспедыцый у парафіяльных архівах Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі. Праводзіцца аналіз раней невядомых, а таксама малавядомых гістарычных дакументаў, такіх, як кнігі канвертывы і кнігі бежмаваній. Раскрываецца інфармацыйны патэнцыял метрычных кніг, пратаколаў прадшлюбных экзаменаў, кніг споведзяў і прычашчэння, не толькі як крыніц па генеалогіі і гісторыі штодзённасці, але і як дакументаў па мікрагісторыі, гісторыі геапалітыкі і г.д. Акрамя гэтага, на аснове комплекснага аналізу робіцца выснова аб тым, што разгледжаныя сакраментальныя дакументы асвятляюць пытанні, звязаныя з мабільнасцю насельніцтва (канфесійнай і геаграфічнай), гістарычнай дэмаграфіяй, дынамікай змены ўзроўню рэлігійнасці. Адзначаецца адна з найбольш сталых асаблівасцяў крыніц, звязаных са святадзеяннем, – феномен паўтаральнасці інфармацыі аднаго выгляду дакументаў у іншых.*

***Ключавыя словы:*** *мікрагісторыя, крыніцазнаўства, Рымска-каталіцкі Касцёл, сакраментальныя крыніцы, хрысціянскае святадзейства.*

**Уводзіны.** Рымска-каталіцкі Касцёл, які з'яўляецца адным са старэйшых рэлігійных інстытутаў у свеце, у працэсе сваёй дзейнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі стварыў вялікую колькасць каштоўных гістарычных крыніц. Галоўнай сферай функцыянавання дадзенай інстытуцыі, як вынікае з яе рэлігійнага характара, з'яўляецца сакраментальная, то бок – звязаная са святадзействам. Падобнае палажэнне дае падставы казаць аб фіксацыі ў пераважнай колькасці гістарычных дакументаў узгадак аб здзяйсненні Сакрамэнта. У дадзеным артыкуле разглядаюцца гістарычныя крыніцы, выяўленыя аўтарам у ходзе палявых археаграфічных экспедыцый у парафіяльных культавых установах, датычныя выключна сакраментальнай функцыі Рымска-каталіцкіх парафій на Беларусі. Па выніках экспедыцый на сённяшні момант фарміруецца калекцыя 3С Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Асноўная частка.** Аналізуючы ўвесь масіў гістарычных крыніц, звязаных са святадзействам, можна выдзеліць дзве буйныя групы: матэрыялы, датычныя метрыкацыі (у якіх фіксуюцца таямніцы хрышчэння, шлюба, інгумацыі); матэрыялы, аб іншых таямніцах (бежмаванні, споведзі, прычашчэнні, сабараванні).

Матэрыялы метрыкацыі (якія ў постсавецкай традыцыі называюцца актамі рэгістрацыі грамадзянскага стана) з'яўляюцца адным з найбольш каштоўных відаў гістарычных крыніц у правядзенні генеалагічных прац. Дадзеныя дакументы ў кантэксце гісторыі паўсядзённасці, а таксама гісторыі народанасельніцтва грунтоўна даследаваны шэрагам айчынных гісторыкаў – Дз.В. Лісейчыкавым [1], В.В. Урублеўскім [2], А.К. Галубовіч [3], С.А. Рыбчонкам [4] і інш. Найбольш раннія кнігі метрык, выяўленыя аўтарам у межах даследавання ў рымска-каталіцкіх парафіях, адносяцца да XVII ст.: метрыкі хрышчэння і шлюбаў Жырмунскай парафіі за 1674–1723 гг., пахаванняў за 1673–1690 гг. [5]; Селіванаўскай за 1681–1693 гг. [6]; Ішкалдскай за 1686–1714 гг. [7] і шмат іншых. Найбольш познія метрычныя кнігі, дасяжныя для даследавання, адносяцца да 1980-ых гг. На сённяшні момант традыцыя весці дадзены від крыніц працягваецца. У парафіяльных архівах сустракаюцца тры віды кніг метрык – брульёны (чарнавыя, ці алтарныя метрыкі), парафіяльныя і дэканальныя (у выпадку, калі парафія з'яўлялася цэнтрам дэканата) кнігі.

Як вынікае з аналіза дадзеных дакументаў, апроч інфармацыі генеалагічнага і дэмаграфічнага характара, яны нясуць звесткі, адносна гісторыі Рымска-каталіцкага Касцёла як у мікрагістарычным зрэзе, так і ў больш буйных пытаннях. Нярэдка ў парафіяльных асобніках метрычных кніг XVII–XVIII стст. сустракаюцца матэрыялы, якія адлюстроўваюць пазіцыю Касцёла па шэрагу палітычных пытанняў. Падобнае захаванне дакументаў звязана з пастановай Трыдэнцкага Сабора 1545–1563 гг. аб абавязковым пастаянным захаванні метрык адмысловым чынам у спецыяльных рэгістратурах і кантролі за іх станам (як вынік – важныя дакументы, змешчаныя ў метрычную кнігу, маглі захавацца лепей) [8, с. 40]. Напрыклад, у метрычнай кнізе хрышчэнняў і шлюбаў Ішкалдскай парафіі былі выяўлены падшытыя лісты Канцлера Віленскага біскупства за 1683 г., у якіх ён заклікаў парафіян маліцца за перамогу хрысціянскай зброі над мусульманамі (як вынікае з даты, ліст прыйшоў напярэдадні Венскай бітвы 11 верасня 1683 г.) [9, арк. 60 – 60адв.]. У кнігах метрык нярэдка адлюстроўваюцца звесткі, датычныя

мікрагістарычных з'яў. Напрыклад, кс. Якуб Казімір Пракаповіч, плебан Ішчальнскі, занатаваў у метрычную кнігу звесткі аб вялікім пажары 1713 г., які панішчыў плябанію з касцельным архівам. Пры гэтым кс. Пракаповіч адзначаў, што частку звестак аб нараджэннях за 1713 г. ён аднавіў па памяці [10, арк. 1]. У кнізе метрык хрышчэнняў часовы адміністратар Нясвіжскай Фары Станіслаў Закрэўскі зрабіў пазнаку аб тым, што метрычныя запісы за 1774–1775 гг. былі перапісаны з іншых, канфіскаваных з невядомай мэтай кніг, затым канфіскаваныя кнігі былі вернуты ў Нясвіжскую парафію і ўнесены ў каталог пасля смерці былога плебана кс. Караля Трацкевіча [11, арк. 8]. Канфіскацыя крыніц у дадзеным выпадку магла быць выклікана шэрагам фактараў: неабходнасцю выяўлення фальсіфікацыі запісаў, дакладнага ўстанаўлення даты нараджэння пэўнай асобы і г. д.

Па метрыках хрышчэння прасочваецца шэраг традыцый, якія перайшлі ў сакраментальнае поле Касцёла праз прызму народнага хрысціянства. Так, шырока распаўсюджанай у дробных парафіях у XVIII–XX ст. з'яўлялася традыцыя хрысціць дзяцей-блізнятак, надаючы хлопчыку імя Адам, а дзяўчынцы – Ева; хлопчыкам блізнятам – Пётр і Павал і г.д. (то бок – імём парных біблейскіх персанажаў) [12, арк. 161]. Шэраг выпадкаў падобнага характара зафіксаваны ў метрыках Белагрудскай, Поразаўскай, Ішкалдскай парафій. Традыцыя называць імёнамі Адама і Евы цяжка хворых дзяцей, якую апісвае шэраг даследчыкаў [13, с. 227], у дадзеных выпадках заўважана не была – паводле метрык пахаванняў, ніводная асоба з прааналізаваных не памерла ў дзіцячым узросце.

У выключных выпадках Касцёл мог здзейсніць Сакрамэнт без прысутнасці асобы. Найчасцей у выключэнні траплялa смерць парафіяніна пры немагчымасці адпраўкі яго цела на радзіму. У дадзеным выпадку метрычная кніга дае каштоўныя звесткі, з аднаго боку, па гісторыі асобы, а з іншага – па гісторыі геапалітычнай. Так, у фондах Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва былі выяўлены дакументы аб разглядзе працэдуры ўнясення запіса аб смерці жыхара г. Ліда Людвіка Аляшкевіча, 26-ці год, сына Адама і Марыі, мужа Гелены з Грушаў, які знік без звестак на румынскім фронце ў 1918 г. і быў прызнаны ў 1930 г. памерлым. Справу разглядала адмысловая камісія Віленскай архідыяцэзіі. У выніку ў 1931 г. было прынята рашэнне ў якасці выключэння ўнесці запіс аб смерці Л. Аляшкевіча ў метрычную кнігу Лідскай Фары. Аналіз брульёнаў метрычных кніг Лідскага Фарнага касцёла дазволіў выявіць запіс аб смерці Людвіка Аляшкевіча [14, арк. 10]. Падобныя выпадкі мелі месца ў 1931 г. у Крэва, Начы і інш. [15, арк. 14].

Метрычныя кнігі другой паловы XX ст. адрозніваюцца фармулярам і інфарматыўнай вартасцю ад аналагічных крыніц XVII – першай паловы XX ст. Так, пры параўнанні сшыткаў парафіяльных метрык вынікае, што рымска-каталіцкія святары ў БССР не мелі абавязковага фармуляра вядзення ўліку метрык, таму паміж інфарматыўнай складаючай запісаў маюцца разыходжанні. Напрыклад, у кнізе хрышчэнняў, шлюбаў і пахаванняў парафіі Лабно за 1943–1949 гг. указвалася толькі імя бацькі асобы, якую хрысцілі, абавязкова ўказваўся ўзрост успрыемнікаў [16], а ў парафіі Селіванаўцы фармуляр метрычнай кнігі ўтрымліваў звесткі аб абодвух бацьках і абавязковы роспіс бацькоў у тым, што яны згодныя, каб дзіцё хрысцілі ў рымска-каталіцкім абрадзе; узрост успрыемнікаў не пазначаўся [17]. Паводле інтэрв'ю, узятага ў мясцовых жыхароў, у 1960-я гг. у Селіванаўскім касцёле не было пастаяннага пробашча, таму перыядычна набажэнствы праходзілі без ксяндза сіламі рэлігійнай абшчыны (якая складалася са сталых асоб). Гэтым можна патлумачыць адсутнасць у некаторых кнігах метрыкі звестак аб святары, а таксама наяўнасць граматычных памылак, якія сустракаюцца ў метрычных кнігах дадзенай парафіі ў 1940–1989 гг. Так, трапляюцца такія варыянты напісання слоў (у рускамоўных крыніцах), як "крезченее" [16, арк. 2], "фамиля" [16, арк. 7], "рождене" [16, арк. 9] і інш. Акрамя гэтага можна заўважыць, што хроснымі бацькамі вялікай колькасці новаахрышчаных з'яўляліся адныя і тыя ж асобы. Метрычныя запісы аб памерлых таксама маюць разыходжанні ў фармуляры – так, у розных кнігах маглі прысутнічаць ці адсутнічаць наступныя фармулярныя часткі: "ці засталася ўдава/удавец", "імя і прозвішча сведкаў пахавання", "імя і прозвішча хросных бацькоў памерлага". Падобныя разыходжанні ў межах беларускіх парафій тлумачацца перадусім ціскам, які аказваўся на Касцёл у згаданы перыяд. У выніку ціска парафіяльныя святары апынуліся ва ўмовах фактычнай ізаляцыі і не мелі магчымасці да выпрацоўкі мер па ўніфікацыі метрычных запісаў. Аналіз фармуляраў і інфарматыўнай змястоўнасці кніг метрык другой паловы XX ст. пралівае святло на пытанні функцыянавання кожнай асобнай парафіі, сувязі з суседнімі парафіямі, ідэалагічнага ціску, узроўня рэлігійнасці ў парафіі.

Паводле касцельнай традыцыі ў XIX ст. як адзін з відаў метрык сталі разглядацца пратаколы прадшлюбных экзаменаў, якія пазначаліся на вокладцы як чацвертая частка метрычнай кнігі (першая – хрышчэнні, другая – шлюбы, трэцяя – паграбенні), што парушала гэтак званую "трохчастковую" традыцыю. Напрыклад, усе пратаколы Валкалацкай парафіі значацца як метрычныя кнігі. Падобная класіфікацыя сведчыць аб тым, што ў бягучым справаводстве дадзеныя крыніцы разглядаліся як дадатак да метрыкі шлюбаў. Напрыклад: Księga Sznurowa Metryczna. Częsc czwarta. O Exzaminach przedslubnych. Dodatek do księgi metryk 2-giey części. Rok 1850–1857" [18, арк. 1]. Праз дадзены від матэрыялаў даследуецца геаграфія, парафіяльная прыналежнасць тых ці іншых населеных пунктаў, сацыяльная стратыфікацыя насельніцтва і г.д. Напрыклад, пры аналізе пратаколаў прадшлюбных экзаменаў Струбніцкай парафіі за

1893–1914 гг. становіцца бачным, што большасць тых, хто праходзіў перад шлюбам сумоўе з плебанам, стала пражываў на тэрыторыі Валкавыскага ўезда (у межах якога знаходзілася парафія Струбніца), быў сялянскага паходжання. Сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб за дадзены перыяд па названай тэрыторыі склаў 32,3 гады. Самы малады парафіянін, які праходзіў сумоўе, меў 17 поўных год, самы сталы – 68 [19]. Аналагічная крыніца з парафіі Эйсыманты за 1855–1862 гг. сведчыць аб тым, што тыя, хто заключаў шлюб, жылі выключна ў парафіяльных населеных пунктах. У ваколіцах Эйсымантаў існавала вялікая абшчына баптыстаў, аб чым сведчаць адказы шэрага сужэнцаў – у прыватнасці 19 асоб назвалі сваю канфесійную прыналежнасць "евангелісцкай" [20, арк. 24]. У больш позніх пратаколах прадшлюбных экзаменаў прасочваецца значнае зніжэнне ўзроста прыняцця шлюба і павелічэнне тэрыторыі, з якой паходзілі асобы. Напрыклад, у парафіі Гожа ў 1938–1946 гг. сярэдні ўзрост склаў 24,2 гады, асобы з'язджаліся фактычна з тэрыторыі ўсёй Беласточчыны і Гродзеншчыны [21]. Аналагічнай сітуацыя выглядала ў парафіі Ішчална ў 1938–1945 гг., 1948–1955 гг. (сярэдні ўзрост – 24,3 гады; асобы з'язджаліся са Шчучыншчыны, Лідчыны, Іўеўшчыны, Воранаўшчыны) [22].

Трэба адзначыць, што па заканчэнні вядзення кожнай з кніг метрык складаліся метрычныя экстракты – перапіс усіх прозвішчаў, якія сустракаюцца ў кожнай асобнай кнізе. Шэраг парафій Рымска-каталіцкага Касцёла заводзіў адмысловыя кнігі індэксаў (Skorowidz), куды ўключаліся звесткі аб усіх ахрышчаных, узяўшых шлюб і памерлых за даволі працяглы перыяд, які мог складаць каля 100 год. Так, плебан Валпянскай парафіі кс. Гіпаліт Маркевіч склаў алфавітныя індэксы кніг ахрышчаных за 1764–1849 гг. з указаннем узроста і спасылкі на метрычную кнігу, у якой сустракалася дадзеная асоба [23, арк. 1]. У Валкалацкай парафіі шэраг ксяндзоў складалі індэксы на ўсе метрычныя кнігі, якія на той момант знаходзіліся ў касцёле. Як вынік, былі створаны індэксы да кніг ахрышчаных за 1871–1936 гг., пахаваных за 1864–1938 гг., узяўшых шлюб за 1849–1936 гг [24]. Дадзеныя гістарычныя крыніцы не з'яўляюцца самастойнымі ў даследаваннях, бо нясуць дапаможную мэту – спрасціць эўрыстыку.

У ХХ ст., пасля прыняцця Указа аб верацярпімасці 1905 г., з'явіўся такі від гістарычных крыніц, як кнігі канвертывы (Liber Convertorum). Дадзеныя дакументы ўяўляюць сабой запісы аб пераходзе з іншых канфесій (пераважна – праваслаўя) у рыма-каталіцтва і сведчаць аб прыняцці асобай асноўных дагматычных сімвалаў новай канфесіі. Фармуляр крыніцы складаецца з трох абавязковых палёў – імя ксяндза-пробашча, які прыняў асобу ў новую канфесію, імя асобы і яе ўзрост, а таксама звесткі аб сямейным стане і месцы жыхарства. Фактычна, дадзеныя гістарычныя крыніцы дублююць запіс аб хрышчэнні з кнігі метрык, аднак не ўтрымліваюць звестак аб успрыемніках. Канвертывы з'яўляюцца карысным матэрыялам у даследаванні рэлігійных настрояў і канфесійнага становішча асобных населеных пунктаў. Напрыклад, у перыяд з 1905 па 1908 г. са 110 жыхароў вёскі Белагруда ў рыма-каталіцызм перайшло 77 асоб [25, арк. 1 – 4адв.], а ў Гродна ў перыяд з 1905 па 1948 г. масавымі былі выпадкі змены канфесіі цэлымі сем'ямі [26, арк. 7–15]. З дапамогай дадзенага віда крыніц становіцца магчымым аналіз зменаў у канфесійнай прыналежнасці заходнебеларускіх парафій па гадах. Так, у 1905 г. у парафіі Маці Божай Анёльскай у Гродна рыма-каталіцызм прынялі 165 асоб [26, арк. 5], у 1912 – 30 [26, арк. 9]; у 1919 – 40 [26, арк. 13 адв.]; у 1926 –42 [26, арк. 17]; у 1931 – 19 [26, арк. 19]; у 1937 – 15 [26, арк. 20адв.]; у 1943 – 3 [26, арк. 21]; у 1948 – 1 [26, арк. 21адв]. У парафіі Задвея ў 1933 г. у рыма-каталіцызм перайшло 14 асоб [27, арк. 3]; у 1936 – 6 [27, арк. 5]; у 1939 – 3 [27, арк. 5адв]. Падобная дынаміка пераходаў існавала ва ўсіх парафіях, дзе захаваліся кнігі канвертываў (на сённяшні момант іх колькасць складае каля 40 асобнікаў). Такім чынам, назіраецца паступовае змяншэнне колькасці асоб, якія пераходзілі ў рыма-каталіцызм з іншых канфесій, што не супадае з тэзісам А. Мірановіча аб празелітычнай палітыцы ўрада ІІ Рэчы Паспалітай у дачыненні да праваслаўных і прыцягненню іх у Касцёл [28, с. 40]. Да кніг канвертывы маглі дадавацца распіскі (Podanie) у тым, што асоба прымае сімвалы веры і абавязваецца вызнаваць рыма-каталіцызм, а таксама знаходзіцца ў цвярозым розуме і яе ніхто да таго не прымушае. Як паказвае аналіз, распіскі з'яўляліся трафарэтнымі і іх змест аднолькавы ў розных парафіях.

Такім чынам, да матэрыялаў метрыкацыі рымска-каталіцкіх парафій у Беларусі варта адносіць кнігі метрык, метрычныя рэестры, кнігі прадшлюбных экзаменаў, а таксама кнігі канвертывы.

Адной з найбольш распаўсюджаных гістарычных крыніц у Рымска-каталіцкіх парафіях з'яўляюцца кнігі споведзяў і прычашчэнняў, якія выяўляюцца амаль у кожным касцёле. Дадзеныя крыніцы ўяўляюць сабой сшыткі з некалькімі абавязковымі інфармацыйнымі часткамі – намінатыўнай (у якой пазначаецца імя, прозвішча, парадкавы нумар, узрост) і сакраментальнай (у якой пазначаецца, якую таямніцу здзяйснялі над асобай – споведзь, прычашчэнне ці абедзьве адразу). Варта адзначыць, што намінатыўная частка фактычна цалкам паўтарае структуру і змест пасямейных спісаў пэўнай парафіі і з'яўляецца перапісам усяго яе насельніцтва. Напрыклад, кніга споведзяў і прычашчэнняў Ішчальнскай парафіі за 1853–1862 гг. у намінатыўнай частцы мае дакладнае падабенства з пасямейнымі спісамі дадзенай інстытуцыі за абраны перыяд [29]. Падобная сітуацыя назіраецца ў парафіі Поразава ў 1852, 1858, 1879, 1861 гг. і інш. [31]. Сакраментальная частка змяшчае пазнаку аб Сакрамэнце (галачку, ці рыску). Дадзеныя гістарычныя крыніцы дазваляюць аналізаваць узровень рэлігійнасці насельніцтва. Напрыклад,

у кнігах споведзяў і прычашчэнняў згаданай вышэй Ішчальнскай парафіі перыядычна сустракаюцца пазнакі на рускай і польскай мовах "не бывает" ці "nie idzie". Таксама ствараецца магчымасць да аналіза колькасных суадносін парафіян, якія здзяйсняюць асноўныя рытуалы і ходзяць да споведзяў і прычашчэнняў да ўсяго насельніцтва пэўнага населенага пункта. Так, у вёсцы Халечаны (Ішчальнская парафія) ў 1852 г. спавядалася і прычашчалася 42 з 58 жыхароў [29, арк. 14], 1864 – 55 з 67 жыхароў [29, арк. 17адв.], 1903 – 77 з 87 жыхароў [30, арк. 52], 1905 – 69 з 78 жыхароў [30, арк. 92 – 93]. Пры гэтым у Сакрамэнце споведзі і прычашчэння не прыймалі ўдзел адныя і тыя ж асобы. Аналагічная сітуацыя з паказчыкамі назіраецца ў Сядзельніках, Дрысвятах, Струбніцы і інш.

У шэрагу выпадкаў дадзеныя аб здзяйсненні Сакрамэнта маглі ўносіцца ў крыніцы несакраментальнага характара. У прыватнасці, паводле І. Гейштаравай звесткі аб бежмаванні (канфірмацыі) перыядычна траплялі ў спісы парафіян (Status Animarum, пасямейныя спісы) [32, с. 130]. У 1917 г. быў прыняты Кодэкс кананічнага права, 798 канон якога патрабаваў занатоўваць інфармацыю аб пабежмаваных у адмысловыя кнігі і захоўваюць іх, што дало пачатак вядзенню такога віда сакраментальных крыніц, як кнігі бежмаванняў [33]. Бежмаванне, якое ўяўляе сабой мірапамазанне асобы з мэтай прыняцця пячаткі Святога Духа (фактычна пацвярджэнне таго, што парафіянін у цвярозым розуме і без прымусаў прыймае сімвалы хрысціянскай веры), з'яўлялася адной з найбольш важных падзей у парафіяльным жыцці. Напрыклад, кс. Генрык Казімір Васілеўскі, плебан з парафіі Валдацішкі, апісваў у касцельнай хроніцы пастырскі візіт біскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага ў парафію ў 1939 г. з мэтай правядзення бежмавання наступным чынам. У гонар прыезда была арганізавана ўрачыстая сустрэча, падчас якой дзеці з Кола міністрантаў (літургічная арганізацыя, якая аб'ядноўвае юнакоў-міранаў, што дапамагаюць пробашчу ў правядзенні службы) выконвалі песні хорам і дэкламавалі вершы, адбыўся арганны канцэрт, а вучні мясцовай школы пад кіраўніцтвам свайго класнага настаўніка напрыканцы праспявалі хорам "Трэцяга мая" (песня ў гонар прыняцця Канстытуцыі Рэчы Паспалітай). На наступны дзень біскуп Ялбжыкоўскі бежмаваў больш як 300 асоб [34, арк. 26–28].

Усе запісы аб асобах, над якімі была здзейснена таямніца, занатоўваліся ў адмысловую кнігу, у якой пазначаўся дзень правядзення Сакрамэнта, імя біскупа, які праводзіў бежмаванне, імя асобы, імя бацькоў, поўны ўзрост, дыяцэзія і парафія, у якой парафіянін быў ахрышчаны. У шэрагу выпадкаў графа з назвай дыяцэзіі была закрэслена, і ў ёй пазначалася сярэдняе (таемнае) імя парафіяніна [35, с. 96]. Кнігі бежмаванняў з'яўляюцца важным матэрыялам у даследаваннях геаграфічнай мабільнасці ў 1921–1939 гг. Як паказвае аналіз крыніц, за адзін дзень бежмавалася вялікая колькасць асоб, пераважна ахрышчаных у парафіі, у якой на дадзены момант адбываўся Сакрамэнт. Так, у 1932 г. у Жырмунах Сакрамэнт прынялі адначасова 420 чалавек, з якіх 1 – з парафіі ў Крупе, 4 – з парафіі Тракелі, 3 – з парафіі ў Осава, 2 – з парафіі ў Ваверцы, 1 – з парафіі ў Нецечы, 2 – з парафіі ў Эйшышках, 1 – з Фарнай парафіі ў Лідзе, 406 – з парафіі ў Жырмунах (96,7% ад агульнай колькасці) [36, арк. 1 – 7адв.]. Падобная сітуацыя назіраецца ў большасці прааналізаваных парафій, сярод якіх варта выдзеліць Белагруду, Лідскую Фару, Селіванаўцы і інш. (колькасць народжаных і ахрышчаных на месцы складае ад 95 да 97%). Адзіным выключэннем у дадзеным выпадку з'яўляецца Поразаўская парафія, дзе ў перыяд з 1921 па 1939 г. адбылося чатыры біскупскія візіты (1928, 1929, 1932, 1936 гг.). Ва ўсіх чатырох выпадках колькасць ахрышчаных народжаных у парафіі Пораза склала 100% [37, арк. 1–16]. Традыцыя вядзення кніг бежмавання была перапынена з далучэннем тэрыторыі Заходняй Беларусі да БССР і адроджана ў пачатку 1990-ых гг.

**Вынікі.** Да сакраментальных дакументаў, якія выяўляюцца ў рымска-каталіцкіх парафіях у Беларусі, адносяцца кнігі метрык аб хрышчэнні, шлюбе, пахаванні; метрычныя рэестры (ці індэксы); пратаколы прадшлюбных экзаменаў; кнігі канвертываў; кнігі споведзяў і прычашчэнняў; кнігі бежмавання. Пры аналізе дадзеных гістарычных крыніц было высветлена, што яны маюць шчыльную ўзаемасувязь паміж сабой і некаторым чынам паўтараюць інфармацыю адна з адной (напрыклад, звесткі аб хрышчэнні адной і той жа асобы могуць быць адлюстраваны ў метрыцы хрышчэння, метрычным рэестры, пратаколе прадшлюбных экзаменаў, кнізе бежмавання). Дадзеныя дакументы апроч інфармацыі аб здзяйсненні хрысціянскіх таямніц выступаюць інфарматыўнай крыніцай па гісторыі рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі ў цэлым. Праз іх аналізуюцца як мікрагістарычныя аспекты функцыянавання дадзенай інстытуцыі – пажары і стыхійныя бедствы ў парафіі, народныя традыцыі, канфіскацыі гістарычных крыніц, так і больш буйныя. Апроч гэтага, сакраментальныя дакументы праліваюць святло на праблемы мабільнасці насельніцтва (канфесійнай і геаграфічнай), гістарычнай дэмаграфіі, дынамікі змянення ўзроўня рэлігійнасці. Трэба адзначыць, што кожная асобная сакраментальная крыніца пралівае святло на аспекты функцыянавання аднаго асобнага парафіяльнага касцёла, у якім была створана, што стварае дадатковыя магчымасці для больш дакладнага і рэпрэзентатыўнага даследавання мікрагісторыі Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. Лісейчыкаў, Дз.В. Комплекс метрычных кніг у фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі / Дз.В. Лісейчыкаў // Архивы и делопроизводство. – 2013. – № 3. – С. 78–86.

2. Урублеўскі, В.В. Крыніцы па гісторыі штодзённасці беларускага сялянства ў XVIII ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.09 / В.В. Урублеўскі. – Мінск, 2014. – 138 с.
3. Голубович, А.К. Источники по генеалогии Беларуси / А.К. Голубович // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. / НГАБ. – Мінск, 2001. – Вып. 1. – С. 97–100.
4. Рыбчонак, С.А. Крыніцы масавага паходжання па генеалогіі Беларусі сярэдзіны XVII – пачатку XX ст. (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.09 / С.А. Рыбчонак. – Мінск, 2010.
5. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 3С. Воп. 6. Спр. 1–2.
6. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 11. Спр. 1.
7. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 18. Спр. 1.
8. Dębowska, M. Archiwa Koscioła Katolickiego w II Rzeczpospolitej / M. Dębowska // Połroznik ABMK. – 2009. – T. 92. – S. 39–51.
9. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 18. Спр. 1.
10. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 32.
11. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 24. Спр. 13.
12. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 18. Спр. 10.
13. Народная демонология Полесья: Публикация текстов в записях 80 – 90-х годов XX века : в II Т. / сост.: Л.Н. Виноградова, Е.Е. Лавкиевская. – М. : Рукописные памятники Древней Руси. – Т. 2. – 2012. – 800 с.
14. Lietuvos valstybęs istorijos archyvas (далей – LVIA). – Ф. 694. Воп. 3. Спр. 1247.
15. LVIA. – Ф. 694. – Воп. 3. – Спр. 1228, 1230.
16. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 19. Спр. 1.
17. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 11. Спр. 16.
18. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 12. Спр. 3.8.
19. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 14. Спр. 9.
20. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 17. Спр. 2.
21. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 11. Спр. 25.
22. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 48 – 49.
23. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 8. Спр. 8.
24. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 12. Спр. 6.1. – 6.2.
25. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 7. Спр. 13.
26. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 1. Спр. 12.
27. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 22. Спр. 2.
28. Миронович, А.В. Ревиндикация православных церквей во II Речи Посполитой / А.В. Миронович // Аспект. Журнал социальных и гуманитарных наук. – 2017. – № 4 (4). – С. 38–50.
29. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 37.
30. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 38.
31. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 10. Спр. 19.
32. Gieysztorowa, I. Wstęp do demografii staropolskiej / I. Gieysztorowa. – Warszawa : Państ. Wydaw. Naukowe, 1976. – 310 s.
33. Codex iuris canonici : prob. Pater Benedictus XVI 27.05.1917 [Electronic resourse] // Digital Library IntraText. – Рэжым доступа: http://www.intratext.com/IXT/LAT0813/_P2J.HTM – Mode of access: 25.03.2018.
34. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 25. Спр. 1.
35. Сыцько, К.В. Кнігі бежмаванняў як крыніца па мікрагісторыі 1921–1939 гг. (паводле дакументаў парафіяльных архіваў) / К.В. Сыцько // Микроистория и история повседневности. Новый взгляд на историческое и культурное наследие : материалы междунар. науч. конф., Браслав, 6 окт. 2017 г. / ПГУ ; редкол. : В.А. Ганский [и др.]. – Минск : Белнаучкнига, 2017. – С. 95–99.
36. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 6. Спр. 11.
37. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 10. Спр. 23.

*Паступіў 08.05.2018*

## SACRAMENTAL DOCUMENTS OF THE PARAFIAL ARCHIVES OF THE ROMAN CATHOLIC CHURCH IN BELARUS AS A HISTORICAL SOURCE

***K. SYTSKO***

*In the article the author discusses the complex of historical sources found during archaeological and archeographic expedition in the parish archives of the Roman Catholic Church in Belarus which include materials related to the rites. The analysis of previously unknown and unexplored historical documents such as conversion books and confirmation books is carried out. Disclosed is the research of the information potential of parish registers, protocols of pre-marriage exams, confession and communion books and not only comment as the sources for genealogy studies and history of everyday life as well as for micro history and history of geopolitics. It's concluded that considered sacramental documents shed light on the problems of confessional and geographical population mobility, historical demography, changes in the level of religiousness. The article shows that one of the main characteristics of the sources associated with the rite is the recurrence of one type of information in other documents.*

***Keywords:*** *microhistory, source criticism, Roman Catholic Church, sacramental sources, Christian rituals.*